мікрараёнаў і жылых раёнаў (№1, Фестывальны і інш., 1960—70-я гг.; у суаўт.), рэстаран «Беларусь» (1967), аэравакзал (1969), будынак Ін-та механікі металапалімерных сістэм АН Беларусі (1972), жылыя дамы па вуліцах Савецкая і Кожара (1979) і інш., мемар. комплекс на брацкіх магілах байцоў нар. апалчэння ў парку імя Луначарскага (1975, у суаўт.) у Гомелі; помнік Смутку да 10-годдзя катастрофы на Чарнобыльскай АЭС ў г. Хойнікі (1996, скульпт. Л.Заграбаева).

**ТА́НЕЦ** (польск. taniec ад ням. Tanz), від мастацтва, у якім мастацкі вобраз ствараецца пры дапамозе эстэтычна асэнсаваных, узгодненых з музыкай і арганізаваных у прасторы рухаў чалавечага цела; асаблівы від духоўнай дзейнасці. Бел. нар. Т. мае шматвекавую гісторыю, асаблівыя пластычную мову, танц. малюнкі, манеру выканання і інш. Вылучаюць Т. прафес. сцэнічныя (класічны, характарны, нар.-сцэнічны, эстр., мадэрн, джаз-Т. і інш.) і быт. (нар., г.зн. фалькл., і бальны, г.зн. сацыяльны). У Беларусі прафес. сцэнічны Т. упершыню выкарыстаны ў оперы «Ідылія» («Сялянка») С.Манюшкі (1852). Класічны і характарны Т., якія зарэкамендавалі сябе як найб. дасканалая танц. сістэма, з'явіліся ў 18 — 1-й пал. 19 ст. ў прыгонных тэатрах Беларусі (гарады Гродна, Нясвіж, Слонім, Слуцк, Шклоў) і дасягнулі росквіту ў 20 ст. ў нац. балетным тэатры (Нац. акадэмічны Вял. тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь, Бел. акадэмічны муз. тэатр і інш.). Нар.-сцэнічны Т. карыстаецца вял. папулярнасцю і найб. ярка прадстаўлены ў дзейнасці праф. (Дзярж. ансамбль танца Рэспублікі Беларусь, харэагр. ансамбль «Харошкі» і інш.) і аматарскіх харэагр. калектываў рэспублікі (гл. *Аматарскае харэаграфічнае мастацтва*). У аснове сучаснага эстр. Т. ляжаць выразныя сродкі аднаго ці некалькіх жанраў харэаграфіі, асаблівасці структурыравання і інш. Сучасныя нар. Т. прадстаўлены мноствам кірункаў. Шырока распаўсюджаны ў Беларусі бальны Т., які развіваецца ў 2 спарт. і побытавай формах. Праф. сцэнічныя і побытавыя Т. займаюць важнае месца ў харэагр. культуры Беларусі.

*С.В.Гуткоўская.*

**ТАНІ́ЧНАЕ ВЕРШАСКЛАДА́ННЕ**, сістэма вершавання, у аснове якой аднолькавая (прыблізна аднолькавая) колькасць моцных, або апорных, націскаў у вершаваных радках. Колькасць ненаціскных складоў паміж імі розная (ад 0 да 8). Ва ўсх.-слав. вершаскладанні літ. танічны верш склаўся ў 19 — пач. 20 ст. на аснове нар. вершаскладання, танічнага па сваёй прыродзе. Вылучаюць некалькі відаў Т.в.: акцэнтна-складовы верш (аднолькавая колькасць акцэнтаў — моцных націскаў, аднолькавая колькасць складоў у вершаваных радках), *дольнік*, тактавік, *акцэнтны верш* (аднолькавая або прыблізна аднолькавая колькасць акцэнтаў у радках). Кожны з іх вызначаецца пэўнай колькасцю моцных націскаў у вершаваных радках. Разам з тым яны адрозніваюцца сваёй мерай свабоды ў дачыненні да колькасці складоў у радках, колькасці ненаціскных складоў паміж націскамі, ужывання рыфмы і інш. Танічным вершам напісаны «Тарасова доля», «Бандароўна» Я.Купалы, «Страцім-лебедзь» М.Багдановіча, «Босыя на вогнішчы» М.Чарота. Т.в. шырока ўжывалася ў творчасці М.Танка, П.Панчанкі, К.Кірэенкі і інш.

*В.П.Рагойша.*

**ТАНК** Максім (сапр. С к у р к о Яўген Іванавіч; 17.9.1912, в. Пількаўшчына Мядзельскага р-на — 7.8.1995), беларускі паэт. Нар. паэт Беларусі (1968). Акад. НАН Беларусі (1972). Герой Сац. Працы (1974). Вучыўся ў Вілейскай, Радашковіцкай, Віленскай гімназіях. Удзельнік рэв.-вызваленчага руху ў Зах. Беларусі. Неаднойчы быў арыштаваны польск. уладамі, адседзеў у турмах каля 2 гадоў. У Віленскай турме выдаваў рукапісны час. «Краты» (1933). З 1939 працаваў у газ. «Віленская праўда», «Сялянская газета». У Вял. Айч. вайну супрацоўнічаў у газ. «За Савецкую Беларусь», працаваў у рэдакцыі газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». З 1945 у час. «Вожык», з 1948 гал. рэдактар час. «Полымя». У 1967—90 старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. У першых паэт. зб-ках «На этапах» (1936), «Пад мачтай» (1938), паэмах «Журавінавы цвет», «Нарач» (абедзве 1937) арганічнае спалучэнне ў бел. маст. слове сінкрэтычнага і інтэлектуальна-асатыятыўнага мыслення, усхваленне вобразаў барацьбітоў за вызваленне Беларусі, сац. партрэт эпохі. Патрыятычныя творы ваен. гадоў увайшлі ў зб-кі «Вастрыце зброю» і «Праз вогненны небасхіл» (абодва 1945). У пасляваен. дзесяцігоддзе паэт асэнсоўваў героіку мінулага («Люцыян Таполя», «Антон Небаба»), усхваляў свет як найвышэйшую каштоўнасць («Дзённік міра»), сцвярджаў мудрасць нар. маралі («Рукі маці»), усхваляў родны край («Ты будзеш жыць, Радзіма!»). Паэт. зб-кі «Каб ведалі» (1948), «На камні, жалезе і золаце» (1951), «У дарозе» (1954), «След бліскавіцы» (1957), «Мой хлеб надзённы (1962) — сведчанне росту канцэптуальнасці паэзіі Т. Узмацненне філасафічнасці лірыкі, паглыбленне гуманістычнага пачатку, арыентацыя на агульначалавечыя маральныя і эстэтычныя каштоўнасці сталі стылявымі дамінантамі творчасці паэта 1970—90-х гг.: зб-кі «Нарачанскія сосны» (1972), Дарога, закалыханая жытам» (1976),



*М.Танк.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ